# ПРАДМОВА

15 ліпеня 1410 г. аб'яднанае войска Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага атрымала пад Грунвальдам бліскучую перамогу над крыжакамі. Пасля гэтай падзеі прайшло 600 гадоў, і таму натуральна, што 2010-ты для гісторыкаў-медыевістаў нашага рэгіёна стаў годам Грунвальдскай бітвы. Дадзенай тэме ў розных краінах былі прысвечаныя шматлікія канферэнцыі, круглыя сталы і іншыя мерапрыемствы. Сярод іншых узнікла таксама і ідэя адзначыць дадзены юбілей, выдаўшы пад адной вокладкай асноўныя працы на гэтую тэматыку беларускіх і літоўскіх даследчыкаў. Ідэю ўдалося рэалізаваць у выпуску спецыяльнага «грунвальдскага» нумара «ARCHE», здзейсненага пры падтрымцы пасольства Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь.

Да ўдзелу ў выданні гэтага нумара былі запрошаныя вядучыя беларускія і літоўскія даследчыкі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага XIII—XIV стст. На жаль, далёка не ўсе з іх з-за вялікай занятасці здолелі адгукнуцца на прапанову, тым не менш, змешчаныя ў нумары тэксты збольшага даюць уяўленне пра сённяшні стан даследавання грунвальдскай праблематыкі як у Беларусі, так і ў Літве.

Вялікія эмоцыі, якія да гэтага часу выклікае ў грамадстве тэма Грунвальдскай бітвы, тлумачацца сярод іншага і адрозненнямі ў яе адлюстраванні, якія склаліся ў розных гістарычных школах. Менавіта таму ў гэты нумар уключаныя артыкулы, якія разглядаюць не толькі саму Грунвальдскую бітву, але і датычную яе крыніцазнаўчую і гістарыяграфічную праблематыку. Так, Руслан Гагуа ў сваім артыкуле апісаў асноўныя крыніцы, на аснове якіх вялося раней і вядзецца сёння вывучэнне падзеяў Вялікай вайны 1409—1411 гг., слушна пры гэтым заўважыўшы, што іхны недахоп з'яўляецца галоўнай праблемай, якая не дазваляе «даць адназначны адказ на шэраг важных пытанняў, якія выклікалі мноства спрэчак у гістарыяграфіі, што доўжацца па сённяшні дзень». Крыніцазнаўчую тэматыку абраў для распрацоўкі і іншы беларускі даследчык, Алег Ліцкевіч, які ў сваім вялікім артыкуле ўсебакова аналізуе пагадненні, якія заключаліся паміж князямі ВКЛ, нобілямі Жамойці і прадстаўнікамі Тэўтонскага ордэна ў Прусіі і Лівоніі ў перыяд з 1367 па 1398 гг.

Цікавай крыніцазнаўчай праблеме прысвечаны артыкул літоўскага гісторыка Кястуціса Гудмантаса «Іншы вобраз Грунвальдскай бітвы: літоўскі летапіс і паэма Яна Вісліцкага «Пруская вайна». У ім даследчык звяртае ўвагу на відавочныя паралелі ў змесце дзвюх вядомых крыніц XVI ст. па Грунвальдскай бітве: паэмы «Пруская вайна» Яна Вісліцкага і «Хронікі Быхаўца». На падставе параўнання гэтых крыніц К. Гудмантас выказвае цікавую гіпотэзу, што «Пруская вайна» магла быць адной з крыніц «Хронікі Быхаўца».

Алег Дзярновіч у адной з дзвюх змешчаных у гэтым нумары сваіх публікацый разгледзеў сярэднявечныя Крыжовыя паходы і Святарныя войны, у тым ліку і пранікненне крыжакоў ва ўсходнебалтыйскі рэгіён як гістарыяграфічную праблему, прасачыўшы адрозненні ў ацэнках гэтых з'яваў, характэрных для прадстаўнікоў розных нацыянальных гістарыяграфіяў. Другі артыкул гэтага аўтара прысвечаны тэме выкарыстання тэмы Грунвальдскай бітвы ў СССР дзеля патрэбаў афіцыйнай ідэалогіі. Напрыканцы дадзенай публікацыі аўтар звяртае ўвагу на «немалы патэнцыял прапагандысцкага выкарыстання» падзеяў 600-гадовай даўніны, робячы выснову, што «толькі больш глыбокае азнаямленне з гісторыяй дапаможа выпрацаваць ідэалагічны імунітэт».

Тэкст вядомага беларускага гісторыка Юрыя Бохана (аўтара шматлікіх публікацый па Грунвальдскай бітве) уводзіць нас у малавывучаную тэму ўзаемаадносін Полацкага княства з крыжакамі на пачатковым этапе пранікнення апошніх у рэгіён. Юры Бохан па-новаму паказаў ролю Полацка ў змаганні з крыжакамі, прыйшоўшы да высновы, што замацаваная ў беларускай гістарыяграфіі думка, нібыта Полацк «з'яўляўся лідарам шырокага фронту антыкрыжацкага супраціўлення» гучыць, мякка кажучы, непераканаўча.

Гісторык і краязнаўца з Ліды Леанід Лаўрэш у артыкуле «Літоўскія прыгоды шэкспіраўскіх персанажаў» закранае вельмі цікавую праблему — удзел у крыжовых паходах на тэрыторыі Прусіі і ВКЛ у XIII—XV стст. вядомых заходнееўрапейскіх арыстакратаў. Аўтар асабліва звяртае ўвагу на тое, што некаторыя з гэтых рыцараў сталі прататыпамі для персанажаў некалькіх вядомых трагедый Уільяма Шэкспіра.

Змешчаныя ў нумары працы літоўскіх гісторыкаў Эдвардаса Гудавічуса, Альвідаса Нікжантайціса, Рымвідаса Пятраўскаса і Кястуціса Гудмантаса добра вядомыя ў Літве, аднак нашмат менш — у іншых краінах. Галоўнай перашкодай для азнаямлення беларускага чытача з дасягненнямі літоўскай гістарычнай навукі да гэтага часу застаецца моўны бар'ер. Пераклад некаторых артыкулаў для «грунвальдскага» нумара гэтую праблему часткова здымае. Пры гэтым варта адзначыць, што ў ацэнцы Грунвальдскай бітвы паміж беларускімі і літоўскімі гісторыкамі няма настолькі значных разыходжанняў, як, напрыклад, у пытанні «спадчыны ВКЛ», паходжання Міндоўга, ягонай каранацыі, дзяржаўнай мовы ВКЛ і шматлікіх іншых. Наадварот, літоўскія і беларускія навукоўцы пры разглядзе дадзенай праблематыкі даволі часта займаюць блізкія пазіцыі і паслядоўна адстойваюць іх у дыскусіях з польскімі і нямецкімі калегамі.

Што тычыцца канкрэтнага зместу публікацый даследчыкаў з Літвы, то артыкул Р. Пятраўскага прысвечаны адлюстраванню Грунвальдскай бітвы ў літоўскай традыцыі. Аўтар крок за крокам паказвае асноўныя тэндэнцыі ва ўспрыманні і прадстаўленні Грунвальдскай бітвы, якія панавалі ў літоўскім грамадстве ў розныя перыяды ягонай гісторыі.

Ацэнку Грунвальдскай бітвы грамадствам Літвы XV—XVI стст. разгледзеў у адным з двух сваіх артыкулаў, змешчаных у гэтым нумары, А. Нікжантайціс. Аўтар заўважае, што менавіта ў той перыяд пачаліся дыскусіі адносна найбольш спрэчных да сённяшняга дня пытанняў: сапраўды ўцяклі літвіны з Грунваль-

дскага поля ці гэта быў толькі манеўр войскаў ВКЛ, і хто насамрэч кіраваў аб'яднанымі войскамі — Вітаўт ці Ягайла? Больш падрабязна гэтыя праблемы закранаюцца ў артыкулах іншых даследчыкаў. Так, адзін з артыкулаў К. Гудмантаса адмыслова прысвечаны тэме ўцёкаў (ці ўсё ж тактычнага манеўру?) літоўскага войска з Грунвальдскага поля, да якой звычайна ў той ці іншай ступені вымушаныя звяртацца і большасць іншых даследчыкаў Грунвальдскай бітвы. Для больш дасканалага разгляду гэтай тэмы ў нумары дадаткова змешчаны і артыкул вядомага шведскага гісторыка Свена Экдаля «Уцёкі літвінаў у бітве пад Грунвальдам», які ў свой час, пасля ягонай публікацыі ў 1963 г., стаў пэўным прарывам у «грунвальдазнаўстве».

Адзін з класікаў літоўскай гістарыяграфіі Эдвардас Гудавічус у сваім даследаванні сцвярджае, што менавіта войску ВКЛ давялося прыняць на сябе асноўны ўдар войска крыжакоў. Закранае ён таксама іншую значную праблему, адносна якой спрачаюцца сучасныя гісторыкі, — дачыненні Ягайлы і Вітаўта перад і падчас бітвы з крыжакамі. Эдвардас Гудавічус акцэнтуе ўвагу на нерашучасці Ягайлы, які да апошняга моманту чакаў прапановаў аб міры. У той жа час Вітаўт хацеў гэтай бітвы і менавіта ён як палкаводзец, на думку Э. Гудавічуса, з'яўляецца галоўным пераможцам у ёй.

Урэшце, лагічна дапаўняюць нумар артыкул А. Нікжантайціса па праблеме ваеннапалонных у Літве і Нямецкім ордэне з 1283 па 1409 гг., а таксама публікацыя С. Экдаля, прысвечаная адлюстраванню Грунвальдскай бітвы ў помніках ХХ ст. Аўтар крок за крокам паказвае, як змянялася адлюстраванне Грунвальдскай бітвы ў розныя перыяды гісторыі ХХ ст. у Літве, Польшчы і Германіі, і якім чынам на гэта ўплывала палітычная рэчаіснасць.

Такім чынам, у гэтым нумары «ARCHE» паказаныя самыя разнастайныя аспекты «грунвальдскай» праблематыкі, хоць, натуральна, і з літоўскага, і з беларускага боку апошняе слова ў гэтым пытанні яшчэ далёка не сказана. Завяршыць жа гэтую прадмову хочацца словамі Рымвідаса Пятраўскаса, сказанымі ім адносна неабходнасці складвання новых формаў памяці пра Грунвальд:

*Разважаючы пра магчымыя формы памяці пра Грунвальд, напэўна варта пазбавіць гісторыю Грунвальда ад афарбаванага ў нацыянальныя міфы адцення і такім чынам па-новаму асэнсаваць гэтае памятнае месца: гісторыя бітвы і яе наступстваў можа быць расказана як цалкам рэальная, але з розных прычынаў няздзейсненая спроба знайсці формы ажыццяўлення міру ў цэнтральна-ўсходнееўрапейскім рэгіёне, змяняючы такім чынам замацаваны анахранічны погляд на гістарычную барацьбу германскіх, славянскіх і балцкіх народаў ды нібыта непазбежную нязгоду Вялікага Княства Літоўскага, Польшчы і Нямецкага ордэна.*

*Андрэй Мацук,*
*Мінск, 22 кастрычніка 2010 г.*